СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар Ігар Герменчук
Заснавальнік: Павел Жук
Выдавец: Таазта СВАБОДА, Ltd.
Наклад 42.000
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская,56
Тэл./факс: 362441

15 сакавіка 1996 г. № 19 Кошт свабодны

Скандал вакол транспартнага калідору можа пахаваць ідэю еўрарэгіёну «Нёман» (стар. 2)
Што такое статус беспрацоўнага і як яго атрымаць? Якія гарантыі дае закон? (стар. 3)

«Абаронім Канстытуцыю – абаронім сябе!»

Пад такім лозунгам прайдзе мітынг у Мінску.

Ён адбудзецца ў пятніцу, 15 сакавіка ад 11-й гадзіны на плошчы каля Опернага тэатра.

А.П.

Чарнобыльскі форум

18-22 сакавіка ў Мінску будзе праходзіць Першая міжнародная канферэнцыя па радыялагічных наступствах Чарнобыльскай аварыі.

У гэтым вялікім прадстаўнічым форуме будуць удзельнічаць каля 1.500 спецыялістаў больш чым з 30-ці краінаў свету.

Арганізуе і фінансуе канферэнцыю Еўрапейская камісія (Брусэль). Першапачаткова меркавалася правядзіць яе ў адной з заходнееўрапейскіх сталіцаў. Адчак толькі прапанова была адасланая Мінску – з мэтай падрыхтоўкі, што менавіта Беларусь найбольш пацярпела ад Чарнобыля.

Мікола ГРЫНЯВІЦКІ

Матачкін сустрэнецца з Лукашэнкам

Як паведамілі ўчора ў міністэрстве па справах СНД, у Мінск прыбывае кіраўнік адміністрацыі Калінінградскай вобласці Юрый Матачкін. Гэты візіт адкладваўся па просьбе беларускага боку.

На 14 сакавіка запланавана падзенне сустрэча Ю.Матачкіна з прэзідэнтам Лукашэнкам, потым сустрэчы з прэм'ер-міністрам, міністрам па справах СНД, а таксама ў Мінскім аблвыканкаме.

Плануюцца перагаворы паглыбленага экаанамічнага супрацоўніцтва з Мінскай і Гродзенскай абласцямі.

Алесь ДАШУКІНСКІ

Філарэт атрымаў «карт-бланш» на школу

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь падпісала пагадненне аб супрацоўніцтве з Беларускім экзархатам Рускай праваслаўнай царквы.

Як адзначаецца ў пагадненні, мэтай супрацоўніцтва — адраджэнне духоўнасці, маральных каштоўнасцяў і культурных традыцый беларускага народа, а таксама "зацвярджэнне гістарычнай ролі праваслаўя у Беларусі".

З пагаднення вынікае, што іншыя канфесіі могуць наладжваць дачыненне да школаяў ды іншыя адукацыйныя ўстановаяў толькі праз Рускую праваслаўную царкву.

М.У.

І Галко не падыходзіць...

Па словах галоўнага рэдактара "Народнай газеты" М.Галко, напярэдадні 8 Сакавіка яму патэлефанаваў прэзідэнт Лукашэнка і прапанаваў пакінуць пасаду "па ўласным жаданні", напісаўшы адпаведную заяву.

Такую інфармацыю Міхаіл Галко паведаміў карэспандэнту "Нарадняй газеты" на пасяджэнні рэдакцыйнай "летучкі". М.Галко сказаў, што "па ўласным жаданні" ён не збіраецца сыходзіць, а чакае, якое рашэнне прыме Вярхоўны Савет.

Як вядома, сярод "кадравых" пытанняў, якія павінны ў бліжэйшы час разгледзець сесіі ВС, ёсць таксама пытаі аб галоўнаму рэдактары "Народнай газеты", які, згодна закану, прызначаецца парламентам. У Міхаіла Галко, на думку многіх дэпутатаў, ёсць нямала ворагаў. Між тым, у парламенскіх кулуарах называюцца таксама іншыя прозвішчы магчымых кандыдатаў на пасаду галоўнага рэдактара "НГ": І.Асінскі, М.Дубоік, А.Гуляеу, Л.Маслоўскі і г.д., і т.п.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

«Белавія» яшчэ жывае

Калі верыць старшыні беларускага Дзяржкамітэта па авіяцыі Ф.Фёдараву, то выходзіць, што лётаць самалётам дзяржаўнай авіякампаніі "Белавія" досыць небяспечна.

Асабіста дзеля сябе я зрабіў такую выснову з прэс-канферэнцыі Рыгора Фёдарава, на якой ён з явіліся шакаванным паведаміў, што самалётны парк "Белавія" знасіўся ўжо амаль на 80 %, большасць самалётаў дакладна выпрацавала устаноўленую мэтадэкорс.

У гэтай сітуацыі мудра пастуціў прэзідэнт Лукашэнка, кулішаў сабе персанальны ТУ-154М. Карэспандэнт СВАБОДЫ спытаў у Р.Фёдарава, ці можна кампенсаваць падаткамі выдаткі на эксплуатацыю і тэрмінаване прэзідэнцкага лайнера, адчак шэф беларускай авіяцыі адказаў, што гэта "некарэктный вопрос".

Затое ад сп.Фёдарава мы даведаемся, што самалёты "Белавія", нягледзячы на застарэласць, абслугоўваюць 40 авіялінй у маштабах СНД, 8 міжнародных ліній і ўсю тольку адну ўнутраную (Мінск—Гомель). Дарэчы, некаторыя госці таму самалёту маюць быць патрэбны ў кожна абласным цэнтры Беларусі, а таксама ў буйныя рэгіянальныя гарады. Напрыклад, з Мінску ў Пінск у сутку было аднак тры рэйсы. На словах Ф.Фёдарава, ад унутраных пасажырскіх перавозак даюць адмовішца, бо яны стаяць вельмі страшэнна для "Белавія".

Віктар ВАЛАДАШЧУК

А што было пасля?..

Помнік дарагому і любімаму

На радзіме прэзідэнта ў вёсцы Аляксандрыя Шклоўскага раёна плануюць пастаяць помнік свайму знакамітаму земляку А.Лукашэнку.

Для конкурсага дызайну ўжо прадстаўлены дзе эскізы будучага манумента. Адзін з іх аўтар мінскі скульптар, а другі — раённы архітэктар. Падрабязнасці аб стварэнні гэтага "шэдэўра" пытайце у наступным нумары.

Аляксандр ЦІАРБАК

Мечыслаў Грыб: «Мы пісалі Канстытуцыю для нармальных людзей»

Вінцуючы народ Беларусі з Дня Канстытуцыі (пад якой, нагадаем, стаіць подпіс Грыба), быць спікер парламента кажадзеу ўспрымаў гэтае свята як сваё. І ніякіх змен у Канстытуцыю сёння ці заўтра нам уносіць не трэба. Мы не пісалі заходзіны з тэкст, што Канстытуцыяй будуць карыстацца нармальныя людзі. Але адбываюцца нападкі — знаходзяцца асобы, якія задумваюць, што "белае — гэта чорнае" і іх ніяк не пераканаць у адваротным. "Самае карыснае, што можа цяпер зрабіць Вярхоўны Савет, — дадаў тлумачэнне начальнік артыкулу Канстытуцыі", — падсумаваў Грыб.

"Канстытуцыя і нас добрая, яна прайшла шматлікія экспертызы у многіх краінах і атрымала выдатную адзнаку. Трэба не шукаць недахопы ў Канстытуцыі, а выконваць тыя артыкулы, якія у ёй ёсць", — упэўнены Мечыслаў Грыб.

Алесь ГАНКОВІЧ

Падпісная кампанія працягнута да 19 сакавіка

Падпіска на газету СВАБОДА прымаецца ва ўсіх аддзяленнях пошты і Саюздруку

Кошты ранейшыя

ЛАТАРЭЯ
ЛАТАРЭЯ
ЛАТАРЭЯ
ЛАТАРЭЯ
ЛАТАРЭЯ
ЛАТАРЭЯ
ЛАТАРЭЯ

Прозвішча, імя,імя па бацьку (або назва фірмы)

Ваш адрас

У Мінскі гарызканам пастуліла заяўка на правядзенне ў сталіцы 24 сакавіка шэсця і мітынгу "у абарону суверэнітэту, Канстытуцыі, законаў і нацыянальнай будучыні Рэспублікі Беларусь".

Гатая падзея прыпаскаваная да 78-й гадавіны абвяшчэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі. Нацыянальны архаістаў святкаваўшае Вясь Быкаў.

Актывісты БНФ патрабуюць спыніць пераслед Канстытуцыйнага суда

Як вядома, два тыдні таму актывісты БНФ пікетавалі будынак розгляднай прэзідэнта Лукашэнку, што па вуліцы Карла Маркса, каб выказаць пратэст з прычыны ціску выканаўчых улад на Канстытуцыйны суд. Учора, 13 сакавіка, пікет у падтрымку Канстытуцыйнага суда быў выстаўлены на плошчы Незалежнасці. Некалькі дзесяткаў людзей трымалі бел-чырвона-белыя сцягі ды плакаты "Сёння тэлефан Канстытуцыйнага суду — заўтра зальюць Беларусь крывёю", "БНФ падтрымлівае законнасць".

Нягледзячы на тое, што нікаторыя збіральніка з тлумачэннем мэтаў пікетавання вострай, панюцца "пікет" не выконана ў бюракратычнага заканадаўстве і, адпаведна, дзе яго правядзенне не патрэбны дазвол улады, навасціся старшыня Мінскага гарвыканкаму Кавалёў правядзенне акцыі. Юрадпіскаў БНФ паначыла такую забароны незаконнай.

Адрэзвіваючы пікету Сяргей Навумчык і Юрась Беленкі атрымалі павесці з'явіцца ў дзедзел міліцыі Маскоўскага раёна і Мінска. Як лічыць старшыня Маскоўскага раённаганага, арганізатараў пікету неабходна прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці.

М.Г.

ЛАТАРЭЯ

У вас яшчэ ёсць шанц выйграць тэлевізар!

СВАБОДА вырашыла зрабіць прыемны падарунак сваім падпісчыкам.

Кожны, хто паспее аформіць падпіску на II квартал (а яна завяршаецца 19 сакавіка), можа стаць удзельнікам нашай акцыі. Галоўны прыз — каляровы тэлевізар. Акрамя таго, будзе разыграна шэра шмат іншых не менш цікавых і карысных прызоў.

Розыгрыш будзе праводзіцца публічна 20 красавіка.

Калі вы хочаце ўдзельнічаць у латарэі, трэба зрабіць дзве рэчы:

1) *Аформіць падпіску на газету СВАБОДА на II квартал (красавік—чэрвень). Падпіска прымаецца да 19 сакавіка ва ўсіх аддзяленнях пошты і Саюздруку.*

2) *Аформіўшы падпіску, выражце з газеты квітак з надпісам "Латарэя", запоўніце яго і дашліце ў рэдакцыю СВАБОДЫ. Пазначым, дасылаць квітак трэба не пазней 25 сакавіка г.г. (па паштовым штэмпелі).*

Квітак "Латарэя" будзе нумераваць у рэдакцыі і 20 красавіка — розыгрыш. Калі пашанцуе, зможаце прысутнічаць пры гэтым і бачыць усё на свае вочы. Дзе тэта будзе здзяйсніцца — СВАБОДА паведаміць.

І самае галоўнае: прызы вы атрымаеце толькі ў тым выпадку, калі пры канцы апошняга падпіснога квітанцыю на II квартал або яе копію падгодзіце. Тады абавязкова запоўніце падпісны купон.

Падпіска на СВАБОДУ каштуе 27 тысяч рублёў. Аформіўшы падпіску, вы гарантавана будзеце атрымляваць цікавую газету і, акрамя таго, можаце шанц выйграць нашы прызы.

Рэдакцыя СВАБОДЫ

СВАБОДА
220088, Мінск, вул.Іванаўская,56
Тэл./факс: 362441

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

«Усход-Захад» дае несуцяшальныя прагнозы

У Акадэміі Навук Беларусі адбылася прэзентацыя штогадовага аналітычнага даклада, падрыхтаванага даследчым цэнтрам «Усход — Захад»

У гэтым выданні група экспертаў падвяла эканамічныя і палітычныя вынікі мінулага года.

Як сцвярджае адзін з экспертаў, кандыдат філасофскіх навук Валерый Карбалевіч, "мінулы год пацвердзіў апасенні, што ўвядзенне інстытута прэзідэнцтва ў нас небяспечнае на ўсталяванне аўтарытарызму. Аказалася, што сістэма стрымліваньняў і процівагаў не працуе, грамадства не мае страхавачных механізмаў ад дыктатуры. У палітычным жыцці краіны ўзмацнялася дамінаванне асобы Лукашэнкі. Прычым, фактар Лукашэнкі адыгрываў хутчэй дэстабілізуючую ролю. Узмацненне яго асабістай улады пагражае перманентнымі канфліктамі".

Кандыдат юрыдычных навук Сяргей Леўшуноў, аналізуючы адносіны паміж галінамі ўлады, адзначае, што "здольнасць парламента вярнуць Лукашэнку ў яго прававое поле, жорстка ўказаць прэзідэнту яго месца ў сістэме падзелу ўладаў сёння выглядае малаверагодным". Сяргей Леўшуноў лічыць, што "суды Рэспублікі Беларусь, не паспеўшы па-сапраўднаму пераўтварыцца ў органы правасуддзя, паступова вяртаюцца да статуса аднаго з "праваахоўных органаў", якімі яны былі ў "старые добрые времена".

Мікола ВАЙТОВІЧ

ЗДАРЭННІ

Нагаварыў на сем мільёнаў

У Івацэвічах упершыню заявілі пра сябе тэлефонныя тэрарысты.

У пажарную частку горада паступіў званок, што "замініраваны райвыканкам". Тэрмінова выкліканыя сапёры праверылі ўвесь будынак, аднак ніякай міны не знайшлі. Міліцыі пакуль не ўдалося выявіць зламысніка, які званіў з вулічнага тэлефона-аўтамата.

А ў Баранавічах нядаўна падобны выпадак лёгка ўдалося раскрыць. Днямі адбыўся суд — грамадзянін Шукала (ён паведаміў пра "замініраваны" цягнік на станцыі Баранавічы-Палескія) атрымаў два гады пазбаўлення волі (умоўна) і 7 млн. рублёў штрафу за нанесеныя матэрыяльныя страты. Суд палічыў гэтае пакаранне дастатковым для чалавека, які 22 гады добрасумленна адпрацаваў на чыгунцы і не меў ніводнай заўвагі.

Ігар БАРАНОЎСКІ

Быў сапраўдным палкоўнікам і джэнтльменам

Беларуская вайсковая пракуратура закончыла расследаванне і прад'явіла абвінавачванне палкоўніку Б., былому кіраўніку Мінскай аб'яднанай тэхнічнай школы, якая рыхтавала шафёраў для ўсяго Мінска і размешчаных у ім войскаў.

Абвінавачванне прад'яўлена таксама галоўнаму бухгалтару школы грамадзянцы Л. Усе яны разам абвінавачваюцца ў прысваенні на працягу некалькіх гадоў грашовых сродкаў больш як на 200 млн. рублёў. Цікава, што нават вопытных вайсковых следчых здзівіў узровень таго даверу, якім карысталася бухгалтарка ў свайго шэфа. Яна магла атрымаць яго подпіс пад любым дакументам. Для гэтага дастаткова было, як прызнаўся палкоўнік, пакласці перад ім белы аркуш паперы... Зараз з такога ж аркуша яму давядзецца пачынаць новае жыццё.

А.Г.

Нават каровы шалеюць

У Кобрынскім раёне ветэрынары ўжо другі раз за гэтую зіму сутыкнуліся з даволі рэдкай хваробай — шаленствам каровы.

Жывёліну, хворую на шаленства, давялося знішчыць у вёсцы Мярніца (калгас імя Дзімітрава). Гэты выпадак небяспечны яшчэ і тым, што хвароба магла перадацца чалавеку.Таму ўсіх калгаснікаў, якія мелі кантакт з хворай каровай, давялося шпіталізаваць.

Ігар БАРАНОЎСКІ

Каўказскі налёт

Валютны фонд Гомельскай філіі "Беларусбанка" за некалькі хвілін паменшыўся на 7 тыс. долараў.

Менавіта на такую суму ў мінулую нядзелю, 10 сакавіка, быў абрабаваны адзін з абменных пунктаў валюты. Злачынца "каўказскай нацыянальнасці" "адключыў" супрацоўніка банка з дапамогай газавага балончыка.

Анатоль ЗАЕЦ

Вы любіце СВАБОДУ,
маеце вольны час і хочаце зарабіць?

Наша газета можа заключыць з вамі дамову на распаўсюджванне СВАБОДЫ

•Мінск 36-24-41 •Орша 4-28-57
•Гродна 45-41-83 •Брэст 26-47-13
•Гомель 55-06-69 •Магілёў 22-63-19

ПРАЕКТЫ

Ці абыдзецца еўрарэгіён «Нёман» без транспартнага калідору?

Сённяшні скандал вакол тэарэтычнай пабудовы транспартнага калідору цераз Сувалкскае ваяводства ставіць пад пытанне саму ідэю стварэння еўрарэгіёна "Нёман", у рамках якога яскрава і абгаворвалася магчымасць пракладкі аўтадарогі паміж Калінінградскай вобласцю Расіі і Гродзенскай вобласцю Беларусі.

Рэч у тым, што ў эканамічныя справы ўмяшалася вялікая палітыка. Псіхалагічна можна зразумець прэзідэнта Лукашэнку, які разам з Ельцыным лёгка правёў на карце Польшчы гэты калідор, нават не цікавячыся думкай самых палякаў. Відаць, ён прызвычаіўся, што ў падобных пытаннях у яго таксама не просяць згоды. Напрыклад, калі раней расіяне абмяркоўвалі ў Варшаве пракладку новага газаправода (Ямал — Заходняя Еўропа) цераз Беларусь і Польшчу, афіцыйнага запыту беларускаму кіраўніцтву яны не рабілі.

Палякі ў падобных пытаннях рэагуюць інакш. Напрыклад, у мінулым месяцы кіраўнік расійскага "Газпрому" сп.Вяхіраў на прэс-канферэнцыі ў Варшаве выказаў сваё пажаданне купіць польскую службу газаразмеркавання. Гэтая прапанова таксама выклікала скандал, бо палякі пабачылі тут пагрозу сваёй эканамічнай незалежнасці.

У прынцыпе, любая краіна зацікаўленая ў развіцці транзітных магістраляў на сваёй тэрыторыі. Аднак "калідор" — тэрмін не інжынерны, а палітычны, бо мае на ўвазе экстэрытарыяльнасць транспартнай артэрыі. У гэтым прычына скандалу. Падобная шуміха, але менш гучная, у Польшчы ўжо здаралася. Яна датычыла пабудовы аўтадарогі Эльблонг — Калінінград. У гэтым выпадку Калінінград атрымліваў бы прамую магістраль да Нямеччыны, якую ў прэсе параўналі з калідорам.

Аднак адна справа — злучыць Калінінградскую вобласць з Нямеччынай, і зусім іншая — з Расіяй, ад якой яна адрэзана. Пытанне ў тым, ці сапраўды новая дарога ў Сувалкскім ваяводстве планавалася як экстэрытарыяльная, гэта значыць з асобнымі, адносна іншых магістраляў Польшчы, правіламі і прывілеямі. Высветліць гэта — справа экспертаў. Магу толькі спаслацца на словы старшыні Гродзенскага аблвыканкама Аляксандра Дубко, які засведчыў, што ў цэлым у эканамічнай зоне "Нёман" планаваліся адзіныя спрыяльныя падатковыя, мытныя, цэнавыя ўмовы, а таксама бязвізавы або спрошчаны праезд. Планавалася стварэнне ў еўрарэгіёне (на тэрыторыі чатырох суседніх дзяржаваў: Польшчы, Беларусі, Літвы і Калінінградскай вобласці Расіі) сумесных прадпрыемстваў з правам замацавання за імі зямлі. Дарэчы, у Сувалках для гэтага ўжо было адведзена 2 тысячы гектараў.

Мэта стварэння еўрарэгіёна цалкам станоўчая — выраўноўванне эканамічнага стану ўсіх бакоў. Ініцыятыва яго стварэння, не зважаючы на скандал, належыць палякам. Яны ўжо стварылі некалькі падобных рэгіёнаў з суседнімі краінамі. Гродзенскія ўлады зрабілі запыт беларускаму консульству ў Беластоку наконт матэрыялаў аб дзейнасці гэтых эканамічных рэгіёнаў, і частку патрэбных дакументаў ужо атрымалі. Падобныя міжнародныя эканамічныя зоны, між іншым, прадугледжаны еўрапейскай канвенцыяй, падпісанай у Мадрыдзе.

Што датычыць будучага еўрарэгіёна "Нёман", дык палякі стварылі ў Сувалках аргбюро для працы над гэтым праектам. 15 сакавіка ў Сувалках плануецца рабочая сустрэча экспертаў Сувалкскага ваяводства і Гродзенскай вобласці, прысвечаная гэтаму пытанню. Аднак невядома, як цяпер павярне справу сам Сувалкскі ваявода Цэзарый Цеслюкоўскі, якога выклікалі ў Кабінет міністраў у Варшаву для тлумачэнняў наконт гэтага самага транспартнага калідору.

Па словах А.Дубко, ідэю стварэння "Нёмана" вельмі актыўна падтрымліваў былы польскі прэм'ер Юзэф Алексы, які пасля "шпіёнскага" скандалу пайшоў у адстаўку. Пан Алексы, напэўна, з аднаго боку, лабіраваў у гэтай справе нейкім чынам інтарэсы Калінінградскай вобласці. З другога боку, у ідэі еўрарэгіёнаў закладзена адна мудрасць: там, дзе суседзі ствараюць сумесныя прадпрыемствы і гандлююць, застаецца мала месца палітыканству, а тым больш ідэалогіі.

Сказаўшы рашучае "не" транспартнаму калідору, палякі, аднак, наўрад ці павінны адмаўляцца ад пашырэння рэгіянальнага эканамічнага супрацоўніцтва. Тым больш, што Ц.Цеслюкоўскі праяўляў ініцыятыву таму, што Сувалкскае ваяводства гаспадарча менеj развітае, і тут значна вышэйшы за іншыя месцы Польшчы ўзровень беспрацоўя.

Скандал вакол новай транспартнай артэрыі высветліў, апроч іншага, яшчэ дзве акалічнасці. Пабудова калідору цераз польскую тэрыторыю нанесла б вялікую эканамічную шкоду суседняй Літве, з якой палякі імкнуцца падтрымліваць добрыя адносіны. Паводле планаў літоўскага міністэрства транспарту, у 1997 годзе ад транзіту ў Калінінградскую вобласць яны спадзяюцца атрымаць 20 % нацыянальнага даходу, а працу на абслугоўванні магістралям павінны мець 120 тыс. жыхароў Літвы.

І другая акалічнасць. Рэспубліка Беларусь даўно адчыніла ў Гданьску генеральнае консульства. Планавалася, што Беларусь будзе актыўна выкарыстоўваць Гданьскі порт. Аднак ні палякі, ні тым больш самі беларусы не зрабілі рэальных крокаў у гэтым накірунку. Пабудова аўтамагістралі цераз Сувалкскае ваяводства аўтаматычна пераарыентуе беларускія грузы ў Калінінградскі порт.

А такая перспектыва не вельмі радуе палякаў.

Сяргей АСТРАЎЦОЎ

ІНІЦЫЯТЫВЫ

Камітэты грамадзянаў не збіраюцца біць вокны

З заклікам ствараць камітэты беларускіх грамадзянаў у падтрымку Канстытуцыі звярнуліся да жыхароў краіны адразу некалькі грамадскіх арганізацыяў. Сярод іх — і навукова-аналітычны цэнтр "Беларуская перспектыва", адным з заснавальнікаў якога з'яўляецца малады палітык Віктар Івашкевіч. Карэспандэнт СВАБОДЫ папрасіў яго патлумачыць сэнс ініцыятывы і расказаць, ці атрымала яна падтрымку.

— Мы выходзілі з таго, што пагроза Канстытуцыі, пагроза незалежнасці нашай краіны рэальна існуе, — гаворыць В.Івашкевіч. Яна ўзнікла не зараз, але менавіта цяпер гэта пачалі адчуваць і звычайныя людзі, а не толькі палітызаваныя групы насельніцтва. Катастрафічнае падзенне жыццёвага ўзроўню суправаджаецца ў нас спробамі пазбавіць людзей права на пратэст. Гэтае права гарантуе нам Канстытуцыя, але Канстытуцыю імкнуцца растаптаць. Што далей? Далей можна пайсці біць вокны, перакульваць машыны... Але можна і не парушаючы закона арганізавана выказаць свае эканамічныя і палітычныя патрабаванні. Мы за такі шлях. Людзі маюць права на выказванне палітычнай волі не толькі на выбарах ці рэферэндумах.

— А чым будуць займацца гэтыя камітэты? Калі гэта не дыскусійныя клубы, а аб'яднанні дзеля дзеяння, то якія дзеянні вы маеце на ўвазе? Можа, пачнуць перагароджваць вуліцы, спыняць транспарт, каб прадэманстраваць свой пратэст?

— Ды не! Напрыклад, той факт, што ўтварыўся аргкамітэт па святкаванні 25 Сакавіка — таксама з'ява кшталту грамадскага камітэту ў падтрымку Канстытуцыі. Ёсць канкрэтная падзея, якую прапануецца адзначыць — мітынгам, святам, прапагандай у друку. У аргкамітэт увайшлі прадстаўнікі розных партыяў, што сведчыць аб масавай падтрымцы ідэі незалежнасці краіны. Гэта таксама патрэбна. Нават патрэбна прадэманстраваць усяму свету, што мы не толькі маем сваю Канстытуцыю, але маем і тых, хто гатовы яе бараніць.

—Карацей кажучы, гэтая ідэя — як апошняя саломінка?..

— Навошта так казаць? У гісторыі любога народа вы знойдзеце такія перыяды, калі ён перажываў цяжкія часы, экзамен на нацыянальную годнасць. Гэта нармальна. У Эстоніі на пачатку перабудовы ўзніклі камітэты эстонскіх грамадзянаў, якія сталі асноўнай формай палітычнай барацьбы за суверэнітэт. Гэта яны, напрыклад, узяліся за збор подпісаў жыхароў краіны ў падтрымку незалежнасці. Яны вывадзілі людзей на мітынгі салідарнасці з Вільнюсам, Рыгай, Тбілісі, калі там пачыналіся крывавыя падзеі. Яны арганізавалі знакаміты "Балтыйскі шлях". Між іншым, ці не таму ў Эстоніі і не пралілося ў той час крыві, што там грамадзянскія камітэты сталі сапраўднай сілай, дэманстрацыяй волі народа.

— У нас разлічваць на такую дэманстрацыю можа толькі вельмі наіўны чалавек...

— Людзі паўсюль розныя, гэта так, але і беларусы не хочуць быць рабамі. У гэтым я ўпэўнены. Да нас у "Беларускую перспектыву" ўжо звяртаюцца тыя, хто ўхваляе ідэю стварэння грамадзянскіх камітэтаў у падтрымку Канстытуцыі і збіраецца дзейнічаць. Яшчэ раз хачу ўсіх папярэдзіць — гаворка не ідзе аб нейкіх экстрэмісцкіх групах ці новай партыі. Мітынг, пікет, шэсце, тлумачальная праца, проста чалавечая падтрымка — вось нашыя метады, каб абараніць свае правы, гарантаваныя Канстытуцыяй. Але хто будзе гарантаваць саму Канстытуцыю? Толькі мы — народ.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Зіма ў Беларусі

Артыкул з амерыканскага часопіса «National Review»

Цягнік з Варшавы ў Мінск можа з поспехам стаць вашай машынай часу. Вы сядаеце ў неакапіталістычнай сталіцы Польшчы ў сярэдзіне 90-х гадоў, а сыходзіце ў Савецкім Саюзе часоў Брэжнева, у сярэдзіне 70-х. Таварыш Ленін пазірае на вас са старых пастаментаў, а бронзавы Фелікс сурова ўглядаецца ў штаб КДБ; на шапках вайскоўцаў ды міліцыянтаў, як і раней, кукарды з чырвонымі зоркамі. Уключыце тэлевізар альбо радыё — і на працягу некалькіх гадзін вы будзеце чуць камуністычныя заклінанні.

У Беларусі ажыццявілася мара савецкіх інжынераў думкі пра выхаванне новай супольнасці людзей — савецкага чалавека. *Homo Soveticus* задумваўся як працавіты, адданы змагар за правы працоўных, які не мае ўласнай гісторыі і, незалежна ад нацыянальнасці, рускамоўны. Я сустрэў такога чалавека ў адным з калгасаў непадалёк ад Мінска. Ягоны стомлены няголены твар паказваў сляды бесперапыннага п'янства. Пад шырокім, роўным ілбом абыякава і невыразна на мяне пазіралі бляклыя вочы. Я спытаў у яго: "Ці пойдзеце вы галасаваць?" "Канечне, — адказаў ён. — Трэба ж падтрымаць уладу".

Такога ж "гома савецікуса" я сустрэў на наступны дзень, калі прыйшоў на выбарчы ўчастак. "Як вы галасавалі?" — запытаўся я. "Канечне, за камуністаў". "Чаму?" "Таму што камуністы нарэшце схопяць за руку гэтых дэмакратаў і навядуць парадак!" — упэўнена і гучна заявіў ён.

Сярод гэтых савецкіх людзей самы савецкі — сам прэзідэнт Лукашэнка. Ягоны вобраз можна ўявіць як сумесь звар'яцелага селяніна з палкоўнікам Кадафі: дэмагог, непрадказальны, супярэчлівы. Напрыклад, не так даўно ён падрыхтаваў указ, каб падручнікі старога ўзору зноў былі ўведзеныя ў праграму школьнага навучання. Калі ж высветлілася, што старыя падручнікі ўжо знішчаныя, Лукашэнка быў змушаны не падпісваць гэты ўказ.

Самая вялікая мара Лукашэнкі — адмовіцца ад чатырохгадовай незалежнасці ягонай краіны. Ягоная першая мэта — аб'яднаць Беларусь з Расіяй. Ён заяўляе, што краіна не мае дастатковых рэсурсаў, таму трэба дамагацца энерганосьбітаў па ўнутраных расійскіх цэнах. Але ягоная сапраўдная мэта — стварэнне неа-СССР, у якім лідзіруючую ролю выконваў бы не расіянін (каб пазбегнуць расійскага імперыялізму). А хто лепш падыдзе да такой ролі, як не той, хто заплаціў за яе незалежнасцю ўласнай краіны? На жаль, успрыманне Лукашэнкі ў самой Расіі далёка не такое, якое хацеў бы ён сам. Нават Жырыноўскі, які зусім не супраць аднаўлення імперыі, назваў Лукашэнку "конюхам".

Тым часам беларуская эканоміка знаходзіцца ў стане вольнага падзення: большасць прадпрыемстваў працуюць няпоўны тыдзень; затрымкі з выдачай зарплаты вагаюцца ад трох да шасці месяцаў; сярэдняй пенсіі хапае толькі на хлеб ды соль; валютныя рэзервы краіны імкліва знікаюць. Рэфармістскія ўрады цэнтральнаеўрапейскіх краін, магчыма, пацярпелі ад першапачатковага заняпаду падчас перыяду рынкачных пераўтварэнняў, але зараз гэтыя краіны перажываюць эканамічны рост. Беларусі ж яшчэ давядзецца заплаціць сапраўдную цану за прамаруджванне з рэформамі. Калі немінучы дзень расплаты настане, Беларусь змушана будзе пачаць рэформы ў аганізуючым стане.

Кантроль прэзідэнта над сітуацыяй у краіне яшчэ моцны, што можна было назіраць падчас выбараў у Вярхоўны Савет. Невыпадкова, што ніводзін прадстаўнік апазіцыі Беларускага Народнага Фронту не здолеў патрапіць у парламент. Але выключэнне апазіцыі з парламенту, зрэшты, як і забарона нацыянальнай сімволікі, можа стаць пагрозай для самога Лукашэнкі. Стан эканомікі настолькі дрэнны, што нават у афіцыйных, савецкіх, прафсаюзаў, якія з задавальненнем служылі пасярэднікам паміж кампартыяй і масамі, лопаецца цярпенне. Нядаўна яны прымусілі ўрад падвысіць мінімальны заробак і абавязалі больш рэгулярна выплочваць зарплату. Але паколькі ўрад не ў стане выканаць гэтыя патрабаванні, незадаволенне прафсаюзаў, безумоўна, будзе ўсё болей узрастаць.

Ці значыць гэта, што Беларусь можна спісаць на сметнік гісторыі? Наадварот. Па-першае, нацыянальная самасвядомасць, хоць і задушаная дзесяцігоддзямі саветызацыі і русіфікацыі, усё ж расце. Беларусы не вельмі ахвотна размаўляюць на роднай мове, але сотні тысячаў людзей аддаюць перавагу незалежным беларускім газетам, нягледзячы на тое, што гэтыя выданні трапляюць у Беларусь занадта позна, бо вымушаныя друкавацца ў Літве. Мае калегі з Захаду былі проста здзіўленыя, наколькі беларусы адрозніваюцца ад большасці расіянаў, якіх яны сустракалі. Ветлівасць, здаецца, іхняя найвялікшая нацыянальная адметнасць. Таму разам з Беларускай нацыянальнай царквой, якая зараз пачынае ўздымаць галаву, цаглінкі нацыянальнай свядомасці ўпэўнена кладуцца ў падмурак нацыі.

Па-другое, Беларусь нельга спісваць, бо гэта індыкатар паводзінаў Расіі. Разам з Украінай гэтая краіна з'яўляецца буферам паміж Захадам і Расіяй. Таму калі Масква пакажа зубы і пачне дамагацца аднаўлення імперыі, ёй перш за ўсё давядзецца сутыкнуцца з апазіцыяй у Мінску.

Па-трэцяе, узмацненне беларускай незалежнасці будзе карысным для рэфарматараў як у Беларусі, гэтак і ў Расіі. Расіі непатрэбны яшчэ адзін хамут на шыі, таму Беларусь, калі будзе вымушаная плыць сама, навучыцца плаваць. Калі беларускі ўрад перастане праводзіць палітыку эканамічнага самазабойства, краіна зможа скарыстаць перавагу свайго геапалітычнага становішча, дзе транзітныя нафта- і газаправоды, а таксама дарогі да чыгункі паміж Захадам і Расіяй могуць прывесці краіну да росквіту.

Нягледзячы на паводзіны Масквы, Лукашэнка выглядае як апошні савецкі кіраўнік, які выклікае ўсё больш абурэння і незадаволенасці свайго народу. Мытны саюз з Расіяй, напрыклад, не прыносіць ніякай выгады Беларусі і выклікае толькі рост інфляцыі. Замест дапамогі старэйшы славянскі брат прадае энергарэсурсы па амаль сусветных коштах. Улічваючы непрадказальнасць Лукашэнкі, можна не здзіўляцца, калі раптам ён выступіць па нацыянальным тэлебачанні з заявай, што заляцанні да Расіі — не больш чым рэкламны трук, а сам ён заўжды быў апантаным беларускім патрыётам і што ягоная сапраўдная святая мэта — рэальная беларуская незалежнасць. Тады Захад павінны ўхваліць гэткія захады і паабяцаць, што як толькі пачнуцца сапраўдныя эканамічныя рэформы, будуць выдзеленыя валютныя крэдыты.

Відавочна, у Беларусі спее новае пакаленне. Ужо цяпер ягоныя парасткі можна ўбачыць у розных клубах Мінска. Як і моладзь 90-х па ўсім свеце, яны захапляюцца кампутарамі, *Internet'ам* вывучаюць англійскую мову. Яны з вялікай ахвотай гавораць пра бізнес, чым пра палітыку. Такія людзі ніколі больш не дапусцяць лукашэнак да ўлады.

Радэк СІКОРСКІ
National Review (ЗША)

ЧТО ДЕЛАТЬ

Вы потеряли работу...

Как выйти из морального кризиса? Куда обратиться за помощью? На кого рассчитывать? Что такое статус безработного, как его получить? Какие гарантии предлагает закон?

Чувство разочарования и неудовлетворенности, страх за будущее своих детей, как цунами, накатывается на наше общество. Но обвинить природу в рождении стихийного бедствия нельзя, а вот предъявить счет за жалкое существование, нищету и безработицу своему государству — можно и нужно. Безработица для многих становится именно бедствием, с которым чаще всего приходится бороться в одиночку. Возможно, в наших материалах вы найдете что-то, что поддержит ваш дух.

Как быть?

Не отчаиваться. Конечно, сложно смириться с тем, что может быть, вы не найдете работу по специальности (каждый четвертый вынужден ее менять), что вы потеряете свой прежний социальный статус, что придется заниматься работой низкой квалификации... Но это лучше, чем остаться ни с чем. Преодолейте внутренний психологический барьер и примите все, что с вами произошло, как очевидный факт. Не стоит доводить себя до депрессивного состояния. Не бойтесь слова "безработный".

Статус безработного

В 1991 году в Беларуси был принят Закон о занятости населения. Таким образом наше государство официально признало существование нового социального слоя — безработных. Согласно Закону, *"безработными считаются трудоспособные граждане в трудоспособном возрасте (женщины до 55 лет, мужчины до 60 лет), постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, не имеющие работы, не занимающиеся предпринимательской деятельностью, не обучающиеся в дневных учебных заведениях либо не проходящие военной службы и зарегистрированные в государственной службе занятости."* Естественно, вы продолжаете самостоятельно искать работу, но не забывайте, что у вас есть основания претендовать на статус безработного. Получить его можно, зарегистрировавшись в центрах занятости по месту прописки.

В Минске это:

1. Заводское отделение — ул.Алтайская, 64, к. 1, тел. 43-60-42.
2. Ленинское отделение — ул.Свердлова, 19, тел. 27-64-77.
3. Московское отделение — пр.Дзержинского, 10, тел. 20-84-19.
4. Октябрьское отделение — ул.Брилевская, 3, тел. 25-82-02.
5. Партизанское отделение — ул.Фроликова, 19, тел. 35-69-01.
6. Первомайское отделение — пр.Ф.Скорины, 113, тел. 63-13-37.
7. Советское отделение — ул.Сурганова, 64, тел. 32-85-54.
8. Фрунзенское отделение — ул.Мельникайте, 3, тел. 23-70-71.
9. Центральное отделение — ул.В.Хоружей, 42, тел. 37-05-98.

Для регистрации необходимо представить:

1. Паспорт (свидетельство о рождении). 2. Трудовую книжку. 3. Диплом или другой документ об образовании. 4. Справку о зарплате с последнего места работы. 5. Декларацию о доходах. Все услуги, связанные с трудоустройством граждан, оказываются бесплатно.

Статус безработного предполагает получение пособия по безработице, которое назначается государственной службой занятости в индивидуальном порядке. Подавляющее большинство безработных получают сейчас по 200-220 тыс. руб. в месяц.

Однако если вы уволены за нарушение трудовой или воинской (учебной) дисциплины; потеряли работу в результате незаконных действий; уволились с последнего места работы по собственному желанию без уважительных причин — в назначении пособия вам может быть отказано. Но при этом вы все же будете пользоваться информационными базами вакансий, которыми располагают все центры занятости. Приобретая статус безработного, вы получаете право на бесплатную помощь и содействие в подборе подходящей для вас работы.

Есть вакансии

При официально существующей в Беларуси безработице имеется и рынок свободных рабочих мест — вакансий.

В службах занятости формируется банк данных о вакансиях как в государственных организациях, так и в коммерческих, частных фирмах. При оценке сегодняшнего рынка вакансий можно отметить, что среди **рабочих** специальностей требуются: *водители, машинисты, трактористы, строители, сварщики, слесари, токари, электромонтеры, закройщики, портные, швеи, продавцы, буфетчики, кассиры, монтажники, фрезеровщики, шлифовщики, неквалифицированные рабочие.*

Каждое четвертое-пятое свободное рабочее место представлено профессиями неквалифицированного труда, каждое пятое — строительными профессиями, каждое двенадцатое — профессией водителя, машиниста, тракториста.

